5. **“Састаў ліку 10”** (Лічэнне ў межах 10)

Практычная адпрацоўка саставу ліку 10.

Паказаць магчымыя варыянты прыгатавання піцы з рознымі начынкамі

6. **“Знайдзі правільны адказ”** (Лічэнне ў межах 20)

На сектарах напісаны лічбы. Вучань павінен падабраць прыклады з аднолькавым адказам на розных кампанентах піцы. Як ускладненне – павялічыць колькасць прыкладаў

7. **“Знайдзі адказ” (Лічэнне ў межах 20)**

На сектарах састаўныя прыклады. Вучань павінен падабраць “інгрэдыенты піцы”з аднолькавымі адказамі.

8. **“Узваж піцу” (Лічэнне ў межах 10 000)**

Палічы колькасць прадуктаў, якія спатрэбяцца для прыгатавання:

- 1 кавалка піцы
- некалькіх кавалкаў
- усёй піцы

Для ўскладнення можна даць заданне перавесці грамы ў кілаграмы.

**Увага!**

Мяркуецца, што зацікаўленыя бацькі і творчыя педагогі прапануюць свае варыянты дадзенай гульні.



***Жадаем прыемнай гульні!***

# ***Дыдактычны дапаможнік “Матэматычная піца”***

***(для вучняў малодшага школьнага ўзросту)***

Аўтары: Цімашчук Наталля Анатольеўна, настаўнік-дэфектолаг,
Пратасевіч Галіна Пятроўна, настаўнік-дэфектолаг,

ДУА “Даўгінаўская сярэдняя школа імя У.І.Слабодчыкава”



**Мэта:** адпрацоўваць навыкі вуснага лічэння, развіваць звязную мову, кемлівасць, назіральнасць, творчае мысленне і кругагляд

**Матэрыял:** 8 набораў прадметных малюнкаў-“прадуктаў” для прыгатавання “піцы” з прыкладамі, лікамі, або ў якасці лічыльнага матэрыялу, гульнявое поле “аснова піцы” – 8 штук

**Формы правядзення:**

- ✓ індывідуальная;
- ✓ парная;
- ✓ групавая

**Метадычныя рэкамендацыі:**

- ✓ прадаўжальнасць гульні залежыць ад канцэнтрацыі ўвагі і зацікаўленасці ўдзельнікаў;
- ✓ хваліце дзіця, калі яно справілася з заданнем і дапамагайце ў час узнікнення цяжкасцей

*Прапануем 8 варыянтаў выкарыстання*

## Заданні

1. **“Запоўні пустое месца”** (Лічэнне ў межах 5)
   (заданне па аналогіі)
   На аснове зроблены розныя кавалачкі піцы. Вучань павінен падабраць такі ж кавалачак піцы. Суаднесці колькасць усіх кампанентаў

2. **«Зрабі такі ж кавалачак піцы»** (Лічэнне ў межах 5)
   (Гульня на адпрацоўку ўвагі і лічэння прадметаў)
   На наборным палатне (аснове для піцы) зроблена “піца”. Неабходна зрабіць такую: палічыць колькасць розных інгрэдыентаў і выкласці па аналогіі на суседні кавалак

3. **“Гатуем піцу”** (Лічэнне ў межах 10)
   (на лічэнне прадметаў)
   На поле (аснову піцы) вучань павінен выкладаць зададзеную колькасць інгрэдзіентаў (Напрыклад: 2 кавалкі каўбасы, 1 кавалак сыру, 3 памідоры. Як ускладненне можна палічыць колькасць усіх кавалкаў і абазначыць адпаведнай лічбай)

4. **“Устанаўленне роўнасці груп прадметаў”** (Лічэнне ў межах 10)
   Зрабі так, каб аднаго кампанента было больш (менш або роўна), чым другога. Для ускладнення можна даць канкрэтнае ўказанне: каб сыру было на … кавалкаў больш (менш або роўна)